ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
5
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 33 (1483)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА*

### ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ

студэнцкага прафкома абмеркаваў работу жыллёва-бытавой камісіі. Разглядаліся пытанні правядзення агляду-конкурсу сярод калектываў інтэрнатаў на лепшую арганізацыю ўмоў працы, быту, адпачынку студэнтаў. Вырашана правесці семінар для старшынь прафбюро і студсаветаў па пытаннях арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, каардынацыі сумесных дзеянняў і распрацаваць крытэрыі ацэнкі ўдзелу прафбюро факультэтаў у дзейнасці калектываў інтэрнатаў.

Адзначаны нізкі ўзровень публічнасці ходу сацспаборніцтва як у інтэрнатах, так і ва універсітэце. У сувязі з гэтым прэс-цэнтру прафкома, студсаветам інтэрнатаў, прафбюро факультэтаў рэкамендаваць разгарнуць шырокую прапаганду вопыту лепшых пакояў і інтэрнатаў.

П. ЛАШЧЕНАК,
намеснік старшыні
студэнцкага прафкома.

### АБ ВАЖНАСЦІ

прафесіі журналіста, яго ролі ў грамадстве і асабістых якасцях, неабходных яму для выканання прафесійнага абавязку, гутарыў з будучыымі калегамі супрацоўнік «Вячэрняга Мінска» А. С. Нікалайчанка. Вялікую цікавасць у слухачоў выклікаў расказ госця аб героях яго публікацый. Студэнты факультэта журналістыкі задалі шмат пытанняў: іх цікавілі адносіны аўтара да асабістых публікацый, матывы яго творчых пошукаў.

В. ГУСАРАЎ.

### САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА

разгледзеў пытанні кантролю за наведваннем і паспяховасцю студэнтаў і меры па паляпшэнню кантролю за самастойнай работай студэнтаў у міжсесійны перыяд (дакладваў начальнік вучэбна-метадычнага цэнтра прафесар А. Ц. Пікулеў). Разгледжана работа савета хімічнага факультэта (дакладвалі дэкан факультэта прафесар В. Ф. Цікавы і дацэнт Э. М. Шпілеўскі).

І. ЯСЮК.

### АГІТБРЫГАДА

Гродзенскага Палаца культуры тэкстыльшчыкаў выступіла перад студэнтамі універсітэта з канцэртнай праграмай: на гераічную тэматыку — «Перамога працягваецца» і антыалкагольную — «Пагаворым начыстую».

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік
студклуба.

## ВУЧОБА КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ

*АДБЫЎСЯ традыцыйны семінар сакратароў камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп.*

*Іменна сакратар камсамольскай арганізацыі акадэмічнай групы з'яўляецца галоўнай дзеючай асобай у сістэме камсамольскай работы. Без працы камсорга, яго зацікаўленасці ў камсамольскай рабоце не можа быць эфектыўных вынікаў.*

*Аднак праведзеныя нядаўна сацыялагічныя даследаванні сведчаць аб зніжэнні аўтарытэту камсамольскага важака. Не заўсёды групы падыходзяць з усёй адказнасцю да выбару свайго кіраўніка. Многія сакратары дрэнна ведаюць не толькі свае абавязкі, але і магчымасці.*

*Аб гэтым і пайшла гаворка на семінары сакратароў камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп.*

*«Не трэба чакаць дапамогі збоку, — адзначыў у сваім выступленні Д. Руткевіч, сакратар камсамольскай арганізацыі групы V курса хімічнага факультэта,— неабходна шукаць свае, нестандартныя, нефармальныя метады работы. Толькі так можна пазбегнуць памылак».*

*Семінар даў магчымасць камсоргам падзяліцца вопытам работы лепшых акадэмічных груп, разам абмеркаваць многія хвалюючыя пытанні, знайсці кожнаму свой творчы падыход да работы камсамольскіх арганізацый.*

*А. ПЕКАР.*



Фота В. КАРАЛЯ.





## ЮБІЛЕЙ ПАБРАЦІМА

### З НАШАЙ ПОШТЫ

*У календары Народнай Рэспублікі Балгарыі 8 снежня не адзначана чырвоным колерам. Аднак усе ведаюць, што сёлета ў гэты дзень спаўняецца 100 год старэйшай навучальнай установе краіны — Сафійскаму універсітэту імя Клімента Ахрыдскага.*

*«АЛЬМА МАТЭР» налічвае 12 факультэтаў, дзе працуе звыш 1.300 выкладчыкаў і навучаецца 10 тысяч студэнтаў. Універсітэт падтрымлівае самыя цесныя сувязі з акадэміяй навук, што дае магчымасць яму ўносіць адчувальны уклад у развіццё навукі, вытворчасці і культуры Балгарыі.*

*Яшчэ ў IX стагоддзі пераемнік справы стваральнікаў славянскай азбукі Кірыла і Мефодзія і іх паслядоўнік Клімент Ахрыдскі заснаваў у розных кутках балгарскай зямлі літаратурныя цэнтры і адукацыйныя школы... З таго часу бярэ свой пачатак гісторыя развіцця балгарскай навукі.*

*Яе слаўным прадаўжальнікам стаў Сафійскі універсітэт, які з'яўляецца ў нашы дні буйным цэнтрам навукова-даследчай працы і карыстаецца вялікім міжнародным аўтарытэтам. Гэта заключаецца не толькі ў абмене студэнтамі і навуковымі супрацоўнікамі з 35 універсітэтамі Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, але і ў праграмах сумесных даследаванняў і навуковых распрацовак. Асабліва трывалыя сувязі падтрымлівае флагман балгарскай вышэйшай школы з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. Ламаносава, а таксама з навуковымі ўстановамі ў Кракаве, Салоніках, Гамбургу, Варшаве.*

*У Сафійскім універсітэце больш тысячы замежных студэнтаў атрымоўваюць адукацыю.*

*Да паслуг навучэнцаў — багатая бібліятэка, дзе нядаўна уступіў у дзеянне яшчэ адзін тэрмінал, які забяспечвае доступ да аўтаматызаваных сістэм Цэнтральнага інстытута навуковай і тэхнічнай інфармацыі ў Сафіі. З дапамогай гэтай тэрытарыяльнай станцыі універсітэт мае сувязь з інфармацыйнымі цэнтрамі ўсяго свету.*

*Албена НАЙДЗЕНАВА,*
*студэнтка І курса*
*факультэта журналістыкі,*
*грамадзянка Народнай*
*Рэспублікі Балгарыі.*

## ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ШКОЛА!

### ДУМКА СТУДЭНТА АБ КНІЗЕ

*Для студэнтаў-філолагаў IV курса наступіла найбольш адказная пара. Упершыню пасля заканчэння школы мы пайшлі ў яе ў новай якасці, у якасці настаўнікаў.*

ВЯЛІКАЯ адказнасць стаіць перад намі, бо, як адзначаецца ў матэрыялах рэформы агульнаадукацыйнай школы, партыя дабіваецца таго, каб чалавек выхоўваўся не проста як носьбіт пэўнай сумы ведаў, але перш за ўсё — як грамадзянін сацыялістычнага грамадства, актыўны будаўнік камунізму, з уласцівымі яму ідэйнымі ўстаноўкамі, мараллю і інтарэсамі, высокай культурай працы і паводзін.

Нашы выкладчыкі паклапаціліся аб тым, каб даць нам рэкамендацыі, выпрацаваныя сучаснай метадычнай навукай, беларускім і айчынным моваазнаўствам. Выйшаў з друку вельмі патрэбны для нас і цікавы дапаможнік «МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ» (АЎТАР ЯГО ДАЦЭНТ КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ З. Б. ВАРАНОВІЧ).

Матэрыял зборніка арыентуе на творчасць, пошук. Задача настаўніка роднай мовы не павінна зводзіцца толькі да прывіцця пэўных моваазнаўчых ведаў, уменняў, навыкаў. Яна значна шырэйшая — навучыць выказваць сябе на роднай мове.

Усё ў кнізе, як кажуць, працуе на настаўніка і вучня. Нават прыклады. Яны ўзяты з твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, нашых выкладчыкаў, такіх, як Ніл Гілевіч, Іван Навуменка, Алег Лойка, Рыгор Барадулін.

Яшчэ і яшчэ раз перачытваю парады педагога. Асаблівую ўвагу звяртаю на тое, якім павінна быць слова настаўніка, якое не толькі вучыць, але і выхоўвае.

Рыхтую канспект першага ўрока, праглядваю табліцы, якія дапамогуць растлумачыць вучням сённяшнюю тэму.

Добры дзень, школа!

Л. СМЯЯН,
студэнтка
філалагічнага
факультэта.

ПРАЕКТЫ ЦК КПСС: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

**На універсітэцкай фундаментальнай аснове з восені 1944 года вядзецца ў нашай рэспубліцы падрыхтоўка кадраў для сістэмы сродкаў масавай інфармацыі. Сёння ў Беларусі працуе больш чым 3000 журналістаў, з якіх 95 працэнтаў маюць вышэйшую адукацыю і 70 працэнтаў — дыплом выпускніка нашага факультэта. Журналісты, што прайшлі ва універсітэце школу пазнання законаў грамадскага развіцця, ідэйнага сталення і прафесійнай спецыялізацыі, удзельнічаюць у важнейшым для партыі ідэалагічным працэсе — фарміраванні грамадскай думкі працоўных рэспублікі.**

# З ПОГЛЯДАМ У ДЗЕНЬ ЗАЎТРАШНІ

СЕННЯ ЖЫЦЦЕ факультэта журналістыкі вызначаецца новымі параметрамі, якія зададзены ў рашэннях красавіцкага і кастрычніцкага (1985 г.) Пленумаў ЦК КПСС, а таксама ў Пастанове ЦК КПСС «Аб паляпшэнні дзейнасці раённых і гарадскіх газет». Мы ўзмацнілі ўвагу да ніжэйшага звяна сістэмы сродкаў масавай інфармацыі рэспублікі і арыентуем сваіх выхаванцаў на працу ў раённай газеце і на раённым радыё. Апытанне супрацоўнікаў раённых і гарадскіх газет, якое праводзілася дэканатам, паказала, што толькі 60 працэнтаў рэдакцыйных работнікаў маюць тут вышэйшую журналісцкую адукацыю. Таму ў адпаведнасці з рэкамендацыямі аддзела прапаганды ЦК КПБ і Саюза журналістаў рэспублікі факультэт пераходзіць на мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў. Прыём абітурыентаў і размеркаванне маладых спецыялістаў з сёлетняга года вядзецца па рэкамендацыях аддзелаў прапаганды абласных камітэтаў партыі. Калі, напрыклад, з Віцебскай вобласці прымала ўдзел у конкурсе гэтага года 12 чалавек і 7 з іх сталі студэнтамі факультэта, то праз 5 гадоў гэтыя 7 выпускнікоў будуць накіраваны на работу ў распараджэнне Віцебскага абкома партыі. І перш за ўсё — у нізавое звяно, дзе не хапае журналістаў з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй.

Калектыў факультэта гатовы да гэтай вялікай, разлічанай на перспектыву працы. Партбюро, якое каардынуе ўсе яе складаемыя, заклапочана галоўным: наколькі эфектыўна, з якой рэальнай аддачай мы працуем? Апошнія гады характарызуюцца сур'ёзнымі пачынаннямі, дзелавымі пошукамі новых форм, аднак яшчэ шмат нявырашаных задач стаіць перад намі.

Няпроста вырашаецца кадравае пытанне. За апошнія 5 гадоў у сувязі з адкрыццём аддзялення міжнароднай журналістыкі на факультэт прыйшла вялікая група маладых выкладчыкаў. Аднак пры ўзятых імі тэмпах прафесійнага росту яны яшчэ няхутка стануць дастойнай зменай старэйшым таварышам і па журналісцкаму вопыту, і па ўзроўню навуковай кваліфікацыі. Амаль трэцяя частка выкладчыцкага саставу — асобы пенсійнага ўзросту. Абмежаваны рэзерв на кіруючыя пасады, недастаткова прыходзіць на выкладчыцкую працу журналістаў, якія маюць багаты практычны вопыт.

Калі і выкладчыкі, і журналісты-практыкі ўсвядомілі сёння, што яны ў поўнай меры павінны быць зацікаўлены ў канчатковым выніку, то не ўсе яшчэ зразумелі, у тым ліку і Саюз журналістаў рэспублікі, неабходнасць не фармальнай, а ўнутранай натуральнай сувязі тэорыі з практыкай. Аснову такіх творчых сувязей — арганізацыйныя прынцыпы — таксама варта прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі і задачамі падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, якія пастаянна павышаюцца.

Мы настроены на напружаную творчую працу, у якой не можа быць перапынку, як няма аднаразовых, прыдатных на ўсе выпадкі жыцця рашэнняў.

Аднак у самім універсітэце некаторыя праблемы падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў працяглы час застаюцца без вырашэння. Справа не ў тым, вядома, што факультэт працуе ў абмежаваных умовах, недастаткова тэхнічна забяспечаны. Горш іншае — відавочнае парушэнне палажэння аб вышэйшай школе, якое праяўляецца ў адносінах да журфака. Яно заключаецца, па-першае, у тым, што мы штучна адарвалі студэнта ад кафедраў, кабінетаў і, адпаведна, ад выкладчыкаў, калі размясцілі іх у розных карпусах, на розных вуліцах. А па-другое, у вучэбным працэсе вымушаны ісці на разрыў тэорыі з практыкай, на лекцыях знаёміць з сучаснымі тэхнічнымі сродкамі журналістыкі, а на практычных занятках працаваць са студэнтамі на абсталяванні 60-х гадоў.

У гэтым вучэбным годзе, напрыклад, пасля «зацяжных баёў» з арганізацыямі па забеспячэнню закончана ўстаноўка апаратуры ў тэлестудыі, падрыхтавана да работы паліграфічная тыпа-лабараторыя. Па-першае, зноў усё ў розных карпусах. А па-другое, яшчэ не пачаўшы працаваць, гэтае абсталяванне ўстарэла. Нашы выпускнікі ў рэальных вытворчых умовах з ім не сустрэнуцца, таму што ў друкарнях замест лінатыпаў сёння прымяняецца фотанабор, а тэлерэпарцёр працуе на партатыўнай каляровай відэатэхніцы.

Каб ліквідаваць нежаданыя негатыўныя тэндэнцыі, якія звязаны з работай на ўстарэлым абсталяванні, і зблізіць навуку з вытворчым працэсам, яшчэ некалькі гадоў назад у Дзяржтэлерадыё БССР нарадзілася вельмі патрэбная ідэя адукацыі на дагаворных пачатках вучэбна-вытворчага аб'яднання ў саставе факультэта журналістыкі, кансерваторыі, тэатральна-мастацкага інстытута, Беларускага радыё і тэлебачання. Галоўная мэта якога —палепшыць працэс падрыхтоўкі кадраў. Вучыць маладую змену асновам прафесіі на рабочых месцах — наказ часу. На жаль, стварыць вучэбна-вытворчае аб'яднанне так і не ўдалося.

На факультэце, акрамя савецкіх студэнтаў, з 1978 года навучаюцца яшчэ і замежныя навучэнцы. Сёння іх 163 чалавекі з 40 краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. Для нармальнага ходу вучэбнага працэсу патрэбны тэлетайп, фота- і кіналабараторыі, рэпарцёрскія магнітафоны, пішучыя машынкі, падшыўкі асноўных замежных выданняў.

Гэта толькі «балявыя» кропкі жыцця факультэта, якія патрабуюць ад парткома, рэктарата і іншых вышэйстаячых інстанцый неадкладнага прыняцця канкрэтных дзейсных мер.

У працэсе вучобы вельмі многа залежыць таксама ад ініцыятывы студэнтаў і жадання працаваць з поўнай аддачай сіл. Калі маладыя спецыялісты няўпэўнена адказваюць на пытанні аб падзеях, якія адбываюцца за мяжой, гэта азначае адсутнасць навыкаў звяртання да прэсы, сістэмнага мыслення і аналізу. А такія выпускнікі, на жаль, у нас ёсць. Прагалы ў падрыхтоўцы маладых журналістаў успрымаюцца асабліва востра. За імі нярэдка стаіць звычка, якая ўкаранілася ў ВНУ,— «цягнуць за вушы» кожнага студэнта да заканчэння ім універсітэта, нягледзячы на тое, што ў працэсе вучобы ён поўнасцю сябе дыскрэдытаваў.

ВНУ і факультэт адказны за лёсы сваіх выхаванцаў, якім выдалі дыплом спецыяліста і пуцёўку ў жыццё. Таму толькі канкрэтным асабістым укладам у агульную справу фарміравання маладых спецыялістаў кожны з нас можа пацвердзіць сваю ідэйную сталасць, прафесійнае майстэрства, гатоўнасць выканаць ускладзеныя на нас задачы. Іменна на гэта накіроўваюць вынесеныя на ўсенароднае абмеркаванне і горача ўспрынятыя камуністамі факультэта праекты новай рэдакцыі Праграмы КПСС і Статута партыі, Асноўных напрамкаў развіцця народнай гаспадаркі краіны.

**Л. ШЫЛАВА,**
**сакратар партбюро факультэта журналістыкі, дацэнт.**

РАЎНЕННЕ — НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

# ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ АБО

**Над гэтым пытаннем разважалі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі: камсоргі акадэмічных груп універсітэта і студэнты IV курса філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта. Гэта група стала пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва універсітэта.**



**ВІЗІТНАЯ КАРТКА ГРУПЫ:**

**У групе 16 камсамольцаў, 2 камуністы. Пяць студэнтаў займаюцца толькі на «выдатна»: Р. Бачко, В. Янч, С. Геут, І. Дубава, Н. Антановіч. Навукова-даследчай работай займаюцца ўсе. Штогод студэнты групы становяцца байцамі будатрада імя Ф. Скарыны. 95 працэнтаў студэнтаў маюць выдатную адзнаку па грамадска-палітычнай атэстацыі.**



**ПЫТАННЕ ДА ГРУПЫ:**

**— Як стала ваша група пераможцай? Гэта была нейкая вызначаная мэта або прыемная нечаканасць?**

АДКАЗ:

— Ці імкнуліся мы стаць лепшай групай? Напэўна, не. Але гэта зусім не значыць, што мы не павінны былі добра вучыцца.

— Мы проста імкнуліся цікава жыць.

— Гэта не павінна быць самамэтай.

— Дасягаць мэты можна любымі шляхамі і нават звязанымі з фармалізмам.

— Дыялектыка не ведае развіцця прагрэсіўнага без нейкай рэгрэсіі. Былі ў нас і спады. Але асноўная тэндэнцыя — станоўчыя, сур'ёзныя адносіны да справы.

**ПЫТАННЕ: З чаго пачыналася камсамольская работа ў групе?**

**І. БУСЕЛ:** З таго, што спярша камсоргам была Ніна Антановіч. Правялі камсамольскі сход, высветлілі адносіны да камсамольскай работы кожнага. Імкнуліся, каб у групе не было раздзялення на радавых і актыўных камсамольцаў, каб кожны меў пастаяннае даручэнне.

**ПЫТАННЕ: Якімі былі ўражанні ў перыяд станаўлення студэнцкага калектыву?**

**А. ЛЕВАНЮК:** На першых занятках частка групы трапіла ў адну аўдыторыю, частка — у другую. А потым, калі ўсё ж сабраліся разам, сталі прыглядацца: хто ёсць хто? Была і першая «бульба», першыя няўдачы. Калектыў паступова мацнеў, станавіўся больш дружным.

**В. ЯНЧ:** Першы вечар, які быў прысвечаны святу Кастрычніка, запомніўся не толькі таму, што на ім мы даведаліся шмат цікавага аб розных краінах свету, з якіх прыехалі замежныя студэнты, але і лепш пазналі адзін аднаго.

**ПЫТАННЕ: Раскажыце пра «тэхналогію» вытворчасці і выкарыстання шпаргалак?**

**У. ГЛУШАКОЎ:** Пра тое, як здаваць сесію, мы думалі доўга. Вядома, тут павінны былі быць, акрамя ведаў, і іншыя рэчы, якія дапамагаюць у адказе студэнту. І нарэшце спыніліся на дэталёвым вывучэнні асабістых якасцей выкладчыкаў. Так, на адзін з экзаменаў прынеслі вялікую карзіну прыгожых руж (загадзя даведаліся, што яны вельмі падабаюцца жанчыне, якая будзе прымаць экзамен). Вынікі былі выдатнымі. І ўсё ж у аўдыторыю да экзаменатара мы імкнуліся больш чым два кілаграмы шпаргалак не прыносіць!

**ПЫТАННЕ: Ці сучасны ў век НТП экзамен? Магчыма, ёсць іншыя формы кантролю ведаў студэнтаў?**

**А. ЛЕВАНЮК:** Я ведаю такія выпадкі, калі выкладчык адразу выстаўляе адзнакі, а ужо потым група пачынае займацца. Згадзіцеся, цікавы вопыт. Так або інакш, але экзамен — гэта своеасаблівы кантроль ведаў, хаця форму яго правядзення мяняць неабходна.



**ПЫТАННЕ: Ці могуць быць у групе ўсе студэнты выдатнікамі?**

**Н. АНТАНОВІЧ:** У прынцы-

# Творчы падыход

Адбылося сумеснае пасяджэнне кафедры палітычнай эканоміі прыродазнаўчых факультэтаў і кафедры агульнай фізікі. У цэнтры ўвагі — забеспячэнне ўсебаковага, комплекснага абмеркавання праектаў новай рэдакцыі Праграмы і Статута КПСС, Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года.

ГАЛОЎНАЙ мэтай эканамічнай палітыкі партыі з'яўляецца няўхільны пад'ём матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця савецкага народа. Рэалізацыя гэтай мэты патрабуе паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця, усямернай інтэнсіфікацыі і павышэння эфектыўнасці вытворчасці на базе навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Разгледжанне сацыяльна-эканамічных пытанняў развіцця грамадства ў цеснай сувязі з дасягненнямі і праблемамі сучаснага НТП, якое арганізацыйна забяспечвалася сумесным пасяджэннем дзвюх кафедраў, паслужыла асновай глыбокага, дзелавога і плённага абмеркавання праектаў дакументаў.

Час прад'яўляе ўсё больш высокія патрабаванні да выпускнікоў універсітэта. Яны павінны мець такія якасці, як ідэйная пераканананасць, кампетэнтнасць, ініцыятыўнасць, уменне нешаблонна мысліць. Таму універсітэцкіх палітэканомаў і фізікаў аб'ядноўвае агульная задача: павысіць узровень навучання і выхавання будучых спецыялістаў.

З дакладам «Актуальныя праблемы ўдасканалення сацыялізму ў святле будучага XXVII з'езда КПСС» выступіў загадчык кафедры палітычнай эканоміі прыродазнаўчых факультэтаў дацэнт М. І. Базылеў.

Выступіўшыя прарэктар універсітэта дацэнт Л. М. Давыдзенка, член парткома універсітэта В. А. Гайсёнак, загадчык лабараторыі электронных сродкаў і метадаў апрацоўкі аптычнай інфармацыі Б. А. Безух адзначылі вялікае палітычнае значэнне, падкрэслілі неабходнасць пастаяннай прапаганды і дасканалага вывучэння перадз'ездаўскіх дакументаў у студэнцкай аудыторыі, выказалі шэраг заўваг, прапаноў, зрабілі шэраг рэдакцыйных правак, якія мэтазгодна ўлічыць пры іх канчатковым зацвярджэнні.

**Л. ДАКУКА,**
**дацэнт кафедры палітэканоміі і прыродазнаўчых факультэтаў.**

# Лічым неабходным

— кардынальна ўдасканаліць работу НДЧ, яе структуру, планаванне навуковай работы;

— паставіць перад вышэйстаячымі інстанцыямі пытанне аб планавым забеспячэнні ВНУ сучасным абсталяваннем і матэрыяламі для вучэбнага працэсу.

**В. ГРУЗІНСКІ,**
**загадчык кафедры агульнай фізікі.**
**М. БАЗЫЛЕЎ,**
**загадчык кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў.**

# Права быць першым

**КАМУНІСТ І ЯГО СПРАВА**

**Адной з рухаючых сіл навукова-тэхнічнага прагрэсу з'яўляецца сучасная электроніка. Задача зводзіцца не толькі да стварэння адпаведных сучаснаму ўзроўню радыёэлектронных прылад, але прафесійнай падрыхтоўкі і выхавання маладых спецыялістаў, якія могуць гэтыя прылады эфектыўна выкарыстоўваць у самых розных галінах навукі і тэхнікі, здольны ўдасканальваць іх у адпаведнасці з патрабаваннем часу. Іменна гэтымі пытаннямі і займаецца калектыў кафедры фізічнай электронікі факультэта радыёфізікі і электронікі, якой кіруе кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Антон Антонавіч Лабуда.**

КАЛЕКТЫЎ кафедры рыхтуе маладых спецыялістаў у галіне фізічнай электронікі і мікраэлектронікі для розных прадпрыемстваў і перш за ўсё для ВА «Інтэграл». Гэтай мэце падпарадкаваны адкрыты ў 1981 годзе філіял кафедры на аб'яднанні.

Шматгадовы пошук форм падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне электронікі прывёў да вываду, што толькі мэтанакіраванае навучанне на базе фундаментальнай фізіка-матэматычнай і агульнай радыёфізічнай падрыхтоўкі дазволіць маладому спецыялісту практычна без перыяду адаптацыі ўключыцца ў творчую работу на прадпрыемстве. Шлях гэты нялёгкі.

Тут патрэбна вырашыць многія праблемы: неабходнасць стварэння новых спецкурсаў і спецлабараторый, перашкоды на прадпрыемстве на шляху доступу студэнтаў да сучаснага радыёэлектроннага абсталявання. Нарэшце, неабходна прабудзіць цікавасць у саміх студэнтаў, якія пры мэтанакіраванай падрыхтоўцы ўжо ў пачатку спецыялізацыі ведаюць, дзе будуць працаваць.

І сёння можна ўпэўнена сказаць, што напружаная праца загадчыка кафедры фізічнай электронікі дае свае вынікі: выпускнікоў запрашаюць на работу ў аб'яднанне і давяраюць ім адказныя ўчасткі ў распрацоўцы і асваенні самага сучаснага радыёэлектроннага абсталявання. З удзелам кафедры фізічнай электронікі на факультэце пачалося фарміраванне навукова-вытворчага студэнцкага атрада, які на працягу ўсяго года будзе працаваць на ВА «Інтэграл».

Адметнай рысай А. А. Лабуды з'яўляецца яго здольнасць прадбачыць патрэбнасці галіны і своечасова канцэнтраваць усе сілы ў гэтым напрамку. Так было з адкрыццём філіяла кафедры і арганізацыяй мэтанакіраванай падрыхтоўкі спецыялістаў, так было і з распрацоўкай навуковых асноў новай плазменнай тэхналогіі ў вытворчасці вырабаў электронікі. Рашэнню гэтых задач падпарадкавана ўся шматгранная работа кафедры: пастаяннае ўдасканаленне вучэбнага працэсу шляхам абнаўлення праграм спецкурсаў і мадэрнізацыі лабараторнай базы, укараненне ў вучэбны працэс сучаснай вылічальнай тэхнікі, развіццё ў гэтым напрамку дзяржбюджэтных навукова-даследчых работ і ўключэнне іх у важнейшыя рэспубліканскія і саюзныя праграмы, укараненне навуковых распрацовак шляхам выканання гаспадарча-дагаворных работ па заданню аб'яднання «Інтэграл». Дзякуючы намаганням А. А. Лабуды кафедра падтрымлівае навуковыя сувязі з многімі навуковымі цэнтрамі краіны, а таксама з Сафійскім універсітэтам НРБ.

Мэтанакіраванасць, самаадданасць, пастаянны пошук — характэрныя рысы А. А. Лабуды на працягу ўсяго перыяду дзейнасці ва універсітэце. Уменне знайсці аптымальныя шляхі і спосабы ўздзеяння на членаў калектыву, здольнасць аб'ядноўваць людзей вакол агульнай задачы, пастаянная патрабавальнасць да кожнага супрацоўніка і студэнта — гэта стыль работы А. А. Лабуды.

Паспяховаму рашэнню задач кафедры ў многім садзейнічае багаты вопыт арганізатарскай работы яе кіраўніка. А. А. Лабуда на працягу 15 гадоў працаваў намеснікам дэкана фізічнага факультэта. Многа сіл і энергіі ўклаў Антон Антонавіч у арганізацыю і станаўленне факультэта радыёфізікі і электронікі. Быў яго першым дэканам на працягу 5 гадоў.

...Яшчэ ў час вучобы ва універсітэце А. А. Лабуда пачаў праводзіць даследаванні ў галіне дыягностыкі газаразраднай плазмы. Гэтым займаецца ён і сёння.

У 1951 годзе на юбілейнай навуковай сесіі БДУ, прысвечанай 30-годдзю ўтварэння універсітэта, студэнт III курса А. А. Лабуда зрабіў свой першы навуковы даклад. Спіс яго навуковых прац сёння налічвае больш чым 100 назваў. Сярод іх — артыкулы ў саюзных і замежных выданнях, даклады на рэспубліканскіх, саюзных і міжнародных канферэнцыях. Цяпер А. А. Лабуда заканчвае работу над афармленнем доктарскай дысертацыі, якая прысвечана распрацоўцы фізічных асноў кантралюемай плазменнай тэхналогіі ў мікраэлектроніцы.

Багаты жыццёвы вопыт і пастаяннае патрабаванне да сябе дазволілі яму вызначыць сваё месца ў калектыве, крытычна ацэньваць дасягнутае і мэтанакіравана рашаць задачы будучага на адказным пасту камуніста-педагога.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
старшы інжынер факультэта радыёфізікі і электронікі.

**ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ З ЛЕПШАЙ ГРУПАЙ УНІВЕРСІТЭТА**

# ВЫПАДКОВАСЦЬ?

пе, у нашай групе ўсё магчыма. Але калі гаварыць больш сур'ёзна, то ў кожнага чалавека ёсць тыя ці іншыя схільнасці. І найбольшым знаўцам ён можа быць у нейкай асобнай галіне ведаў. Да таго ж выпадковасць ёсць праяўленне і дапаўненне неабходнасці. Усе могуць і павінны вучыцца добра і выдатна. Але выдатнікамі быць усім зусім неабавязкова.

**ПЫТАННЕ: Што вы лічыце самым негатыўным у характары лідэра?**

**У. ГЛУШАКОЎ:** На першым курсе нас было 25, цяпер — 18. Ёсць у нас і лідэры, і душа калектыву. Але ніхто не ставіць перад сабой мэты стаць лідэрам. І таму такія лідэры нам проста неабходны.

**І. ШУТ:** Лідэр абавязкова павінен умець працаваць з людзьмі, быць уважлівым чалавекам, вельмі тактоўным.

**В. ГЛІНА:** Лідэры не павінны жыць толькі для сябе.

**А. ФЯСЕНКА:** Непрымальнай якасцю лічу кар'ерызм.

**Н. АНТАНОВІЧ:** Для сучаснага камсамольца - лідэра вельмі дрэнная рыса — лібералізм. Патрэбен больш строгі падыход да справы.

**ПЫТАННЕ: Студэнцкая сям'я. Якія праблемы вы бачыце ў яе стварэнні?**

**У. ГЛУШАКОЎ:** Я быў удзельнікам групы, якая праводзіла сацыялагічныя даследаванні сярод насельніцтва Мінска. Высветлілася, што самая малая колькасць разводаў сярод студэнцкіх сем'яў. Але калі дэканат, камітэт камсамола, прафсаюзны камітэт будуць яшчэ больш уважлівымі да студэнцкіх сем'яў, то трэба спадзявацца, такіх разводаў не будзе наогул. Зараз у нашай групе 6 сем'яў.

**ПЫТАННЕ: Чаму нежанатыя астатнія?**

**В. ГЛІНА:** Мы ўсе хутка жэнімся.

**ПЫТАННЕ:** Дзе можна пазнаёміцца з дзяўчынай?

**В. ГЛІНА:** Я са сваёй нявестай пазнаёміўся два гады назад ва універсітэцкай бібліятэцы.

**В. ГЛУШАКОЎ:** Мілыя дзяўчаты, больш уважліва адносьцеся да філосафаў, якія абяцаюць на вас жаніцца...

**ПЫТАННЕ: Як рашае праблему прагулаў стараста? Пакрывае прагульшчыкаў або адзначае ў журнале?**

**В. ЯНЧ:** Гледзячы калі, каму і пад які настрой.

**АД РЭДАКЦЫІ:** Група ўпэўнена, што Валерый з'яўляецца не прадстаўніком дэканата ў групе, а прадстаўніком групы ў дэканаце.

**ПЫТАННЕ: Як выконваюцца камсамольскія даручэнні?**

**У. ГЛУШАКОЎ:** Пра работу ся прафорга я даведаўся, калі вучыўся на падрыхтоўчым аддзяленні. І таму калі выбіралі прафорга ў групе, я сам выказаў жаданне быць ім. Зараз не шкадую. Так, думаю, мяркуюць і мае сябры.

**І. БУСЕЛ:** Не трэба думаць, што ў нас, у лепшай групе ўсё так добра. Людзі сямейныя. Каму трэба дадому спяшацца, а каму з садзіка дзяцей забіраць. А тут — мерапрыемствы. Праблемы ёсць і ў нас. Але патрэбна быць аптымістам.

**ПЫТАННЕ: Ці думалі вы калі-небудзь, што хутка прыйдзе развітанне? Як у далейшым будуць працягвацца вашы сяброўскія сувязі?**

**А. ЛЕВАНЮК:** Мы пра гэта яшчэ не думалі. Момант развітання вельмі непажаданы. Вядома, будзем сустракацца.

**ПЫТАННЕ:** Якую ўзнагароду вы чакаеце?

**В. ЯНЧ:** Не будзем утойваць, што ўзнагароду мы чакаем. Мы — матэрыялісты, і ўсё ж духоўны пачатак у даным выпадку ў нас дамініруе. Хацелася б з'ездзіць у Ленінград, пабываць у Эрмітажы.

**Прэс-канферэнцыя закончылася, хаця пытанняў яшчэ шмат маглі задаць камсоргі. Адказ на кожнае з іх быў бы адзін: група IV курса філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта стала лепшай ва універсітэце не выпадкова. Яшчэ калі студэнты былі на II курсе, ужо тады іх называлі ў ліку першых.**

**«У нас у кожнага была свая справа»,— сказа пасля канферэнцыі Н. Антановіч. Так, у кожнага з іх была свая справа — вучоба, навуковая работа, спорт, будатрад, камсамольскае даручэнне, да якіх яны падыходзілі з поўнай адказнасцю. А аб'ядноўвала іх справа, якая грунтавалася на інтарэсах агульных, узаемадапамозе, увазе да таварышаў. Гэта і стала складаемым іх поспеху.**

Матэрыял падрыхтавала
**А. МАТУСЕВІЧ.**







*У час прэс-канферэнцыі.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

ПІШУЦЬ ВЫПУСКНІКІ УНІВЕРСІТЭТА

# «ДЗЯКУЙ, КРАІНА САВЕТАЎ!»

*«ЧАМУ ТАК?» Часта пытае танзанійская журналістка Вікі Нтэтэма, натыкаючыся на жорсткія законы капіталістычнага ладу жыцця. Прычына гэтых пытанняў Вікі, напэўна, даволі простая. Большасці яе аднагодкаў не пашанцавала ўбачыць сваімі вачыма, як можна жыць па-іншаму, лепш. Затуманеныя буржуазнай прапагандай, іх думкі не знаходзяць выхаду да разумення сваёй грамадзянскай абмежаванасці.*

*«Лішні чалавек» стаў вельмі папулярным на Захадзе. Але той, хто калі-небудзь пабачыў, як жывуць савецкія людзі, будзе мець сваё, непадатлівае ніякай прапагандзе, меркаванне. Яна амаль 7 гадоў жыла ў Краіне Саветаў, скончыла факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна і добра ведае, як можна жыць лепш. Таму пытанне «Чаму так?» гучыць у яе асэнсавана.*

*Сёння мы прапануем радкі са шматлікіх пісьмаў, якія атрымліваюць ад Вікі яе былыя выкладчыкі.*

### ДЫПЛОМ НА ТРАІХ

Я ЛЮБІЛА ўсіх, хто быў вакол мяне. Але вось Алену Аўрусевіч, Ніну Раманаву і Галю Козел усё ж выдзяляла. Можа таму, што яны больш за ўсіх былі побач са мной, а магчыма і таму, што я знайшла ў гэтых людзях жаданне заўсёды прыйсці мне на дапамогу. Дзяўчаты заўсёды раіліся са мной і я з імі.

Памятаю адзін выпадак. За 6 месяцаў да абароны дыплома я вярталася з акадэмічнага водпуску. Ехала разам са студэнтам, які жыве ў Варшаве. У дарозе нашы аднолькавыя чамаданы пераблыталі. А там — значная частка маёй дыпломнай работы...

Напэўна, мой навуковы кіраўнік Валерый Мікалаевіч Шэйн хваляваўся болей за мяне. Ён не шкадаваў свайго асабістага часу, займаючыся са мною. На дапамогу прыйшлі сяброўкі Ніна і Галя. Чарнавікі работы я пісала на англійскай мове, бо не вельмі добра валодала рускай. Дзяўчаты дзень і ноч сядзелі са мной, разбіралі, перакладалі... Агульнымі намаганнямі мы ўзнавілі дыпломную работу! Што б я рабіла без іх? Не, пра такое нельга забыцца. Не ведаю, ці сустрэну калі-небудзь яшчэ такіх чулых, уважлівых людзей.

### «ДЗЯКУЙ!»

ГАРАЧЫЯ летнія дні раптам змяніліся подыхам халоднай восені. А я да гэтай хуткай змены надвор'я была яшчэ зусім не гатова. Лёгкая сукенка грэла слаба, калі я вярталася ў Мінск з Масквы. Раніцай праваднiца пабудзіла і пачаставала смачнай гарбатай. Я заўважыла, што накрыта дзвюма коўдрамі.

— Хто мяне накрыў?

— Вы паўднёвыя людзі, вам, мусіць, халадней, чым нам,— адказаў сусед.

— Дзякуй,— сказала я, хаця мне стала сорамна, бо ён быў накрыты толькі прасцінай.

— Вам далёка ад вакзала?

— На Кастрычніцкую, у вялікі дом за мостам.

— Значыць, ва універсітэце вучыцеся?

— Так, журналісткай буду.

— Дазвольце, я вас праваду, а то на двары дождж, вы зусім прамокнеце. Я дам вам куртку.

Я бачыла яго першы раз. Ён быў апрануты ў святочны касцюм і куртка была патрэбна яму самому.

Па дарозе ў інтэрнат мы ішлі моўчкі. Каля дзвярэй развіталіся, падзякавала яму за куртку. Калі б усе людзі на зямлі былі такімі чулымі! Але чаму я не даведалася, як яго завуць, дзе ён жыве? «Дзякуй, дзякуй, дзякуй...»,— паўтарала я, увайшоўшы ў свой пакой на шостым паверсе.

### «ПРЫМУШАЮЦЬ»

АНГЕЛІНА АЛЯКСАНДРАЎНА РУДЭНКА. За знешне строгім тварам гэтай жанчыны хаваецца цёплае, мацярынскае, справядлівае, шчырае. Аднойчы Ангеліна Аляксандраўна выклікала мяне да сябе. У той час яна была намеснікам дэкана факультэта па рабоце з замежнымі студэнтамі. Думала, будзе размова аб вучобе або пра жыццё ў інтэрнаце.

— Скардзяцца на вас з паліклінікі. Чаму вы не жадаеце лячыцца?

— А я не хворая.— Смешна неяк стала: што гэта з урачамі зрабілася? У мяне нічога не баліць, а яны патрабуюць лячыцца. Нешта парадаксальнае.

— Магчыма, зараз вы і не адчуваеце. Але нашы ўрачы кваліфікаваныя. Дарэмна вас турбаваць не сталі б. Раю вам як дачцы, Вікі, сёння ж схадзіце ў паліклініку.

Як высветлілася потым, у мяне была павялічаная кіслотнасць.

На канікулах гасціла ў сястры. Там, у Лондане, у мяне абвастрылася язва страўніка. Дапамога ўрача — уваход да яго, аналіз, рэцэпт — абышлася мне ў 25 фунтаў стэрлінгаў...

«Пакуль ёсць магчымасць, лячыся ў СССР»,— гаварыла мне сястра, хаця ёй не верылася, што недзе за самае дарагое — здароўе — не трэба плаціць грошай.

Такой уважлівасці, добразычлівасці ў адносінах да людзей я не сустракала нідзе, акрамя Савецкай краіны.

З любоўю да
савецкіх людзей
**ВІКІ НТЭТЭМА.**





## ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ

НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

*СТУДЭНТУ добра вядома: каб стаць ім, недастаткова пераадолець прыступку ўступных экзаменаў. Гэтак жа недастаткова на «добра» ці «выдатна» завяршыць першы семестр навучання. У чым жа сакрэт ператварэння школьніка, рабочага, калгасніка, воіна ў студэнта?*

*У тваёй пазіцыі да жыцця свайго курса, факультэта, універсітэта. У табе, першакурснік! Зразумееш, што студэнт — гэта не толькі сума ведаў, якія ты ўспрымаеш ад выкладчыкаў, падручнікаў, канспектаў...*

*Аб гэтым і гаварылі першакурснікі факультэта журналістыкі на вечары «Пасвячэнне ў студэнты».*

***НА ЗДЫМКАХ:** апошнія «штрыхі» перад канцэртам; песню «са шпаргалкі» выконвае Ігар Адамовіч, студэнт II курса факультэта журналістыкі; памятныя медалі — першакурснікам.*

*Тэкст і фота*
***А. ВАЛОШЫНА.***



# Кніга і ты

*МАГАЗІН «Навукова-тэхнічная кніга» (Ленінскі праспект, 48, ст. метро «Плошча Я. Коласа») — адзіны спецыялізаваны магазін у Мінску з багатым асартыментам літаратуры па розных галінах ведаў. Выкладчыкі і студэнты заўсёды знойдуць на яго паліцах патрэбную кнігу. Сёння мы прапануем некалькі выданняў для студэнтаў матэматычных і фізічных факультэтаў.*

**Калашнікаў С. Г. «Электрычнасць».** Вучэбны дапаможнік напісаны на аснове курса лекцый, якія аўтар на працягу шэрагу гадоў чытаў на фізічным факультэце МДУ. У дапаможніку ў сціслай, але яснай форме дадзены асноўныя законы электрадынамікі, іх фізічны сэнс.

Выдавецтва «Вышэйшая школа» падрыхтавала для студэнтаў-завочнікаў **«Заданні для самастойнай работы па агульнай фізіцы».** Дапаможнік змяшчае тэарэтычны матэрыял і прыклады рашэння тыпавых задач. Заданне зыходных даных таблічным спосабам забяспечвае максімальную самастойнасць выканання вучэбных задач.

**«Даведнік па матэматыцы» Г. Корна, Т. Корна** з'яўляецца пераводным з другога амерыканскага перапрацаванага выдання. Кніга для навуковых супрацоўнікаў і інжынераў, але можа з поспехам выкарыстоўвацца і студэнтамі, бо яе адрознівае шырокі ахоп матэрыялу. У ёй асвятляюцца амаль усе пытанні як агульнага курса матэматыкі, так і большасці спецыяльных раздзелаў, вывучаемых у ВНУ. Гэтую кнігу можна разглядаць як дастаткова поўны збор тэарэм і формул.

Універсітэцкае выдавецтва прапануе вашай увазе вучэбны дапаможнік **«Вышэйшая матэматыка» А. Гусака** для студэнтаў хімічных, біялагічных, геалагічных і геаграфічных спецыяльнасцей.

**Г. ХІТРЫК,**
**таваразнаўца па рэкламе**
**магазіна «НТК».**

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

# «Пад знакам Бахуса»

***ДЭКАНАТ** геаграфічнага факультэта наконт артыкула «Пад знакам Бахуса» (нумар 29 ад 31 кастрычніка 1985 года) паведамляе, што матэрыял быў абмеркаваны на I — IV курсах факультэта. Паводзіны студэнта I курса А. Фінчанкі абмеркаваны на камсамольскім сходзе групы і савеце прафілактыкі. Праведзена гутарка ў дэканаце з А. Фінчанка і яго маці. Распараджэннем па дэканату студэнту А. Фінчанка аб'яўлена строгая вымова. Ён папярэджаны, што пры паўтарэнні такога выпадку яму пагражае адлічэнне з універсітэта.*

***І. ГАЛАЙ,***
*намеснік дэкана*
*геаграфічнага факультэта.*

**ДЫРЭКЦЫЯ студэнцкага гарадка паведамляе, што артыкул «Пад знакам Бахуса» уважліва вывучаны і абмеркаваны кіраўніцтвам студэнцкага гарадка і на нарадзе камендантаў інтэрнатаў. Да гэтага матэрыял абмяркоўваўся на пасяджэннях студсаветаў і сходах жыхароў інтэрнатаў №№ 2, 7. Вырашана ўзмацніць меры ўздзеяння да аматараў спіртнога, што цалкам адпавядае плану мерапрыемстваў студэнцкага гарадка па выкананню Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму».**

**З пачатку бягучага навучальнага года амаль 80 студэнтам была затрымана выдача ордэраў. Частка гэтых студэнтаў не была паселена ў інтэрнаты. Яшчэ 10 выселена з інтэрнатаў, а некалькі чалавек з абслугоўваючага персаналу звольнены з пасады за ўжыванне спіртных напіткаў.**

**Прымаюцца меры і да замежных студэнтаў, якія ўжываюць спіртное: на пэўны час яны пазбаўляюцца права запрашаць да сябе гасцей, аб іх паводзінах паведамляецца ў дэканаты, прарэктару па замежных сувязях, ім выносяцца вымовы, памяншаюцца стыпендыі.**

**Студэнцкімі саветамі, прафбюро, дэканатамі, персаналам студгарадка, іншымі органамі і арганізацыямі ў інтэрнатах разгорнута значная работа па стварэнню здаровага быту і адпачынку, правядзенню культурна-выхаваўчай работы з савецкімі і замежнымі студэнтамі.**

Я. ШАБАНОВІЧ,
дырэктар студгарадка.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

5 снежня 1985 г.
Зак. 3161. АТ 13857.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.